**ДАДАТАК**
**да пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**ад 26.02.2024 № 06-01-14/2240/дс/**

# УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ IV РЭСПУБЛІКАНСКАГА ФЕСТЫВАЛЮ-КОНКУРСУ ДАСЛЕДЧЫХ ПРАЕКТАЎ НАВУЧЭНЦАЎ "НАШЧАДКІ ТРАДЫЦЫЙ"

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Дадзеныя ўмовы вызначаюць парадак арганізацыі і правядзення IV Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў "Нашчадкі традыцый" (далей – конкурс).

1.2 Конкурс распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2011 № 59.

1.3 Конкурс праводзіцца ў адпаведнасці з Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі, Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2021–2025 гады, Дзяржаўнай праграмай "Адукацыя і маладзёжная палітыка" на 2021–2025 гады, Праграмай патрыятычнага выхавання насельніцтва на 2022–2025 гады.

1.4 Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі).

1.5 Конкурс праводзіцца з мэтай патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэння рэгіянальных народных традыцый і развіцця дзіцячай даследчай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва.

Задачы:

даследаваць самабытную з'яву традыцыйнай народнай культуры рэгіёна і прадставіць аўтарскі праект па яе ўкараненні ў сучасную культурна-адукацыйную прастору;

падтрымліваць і развіваць творчую ініцыятыву па выкарыстанні і распаўсюджванні народных мастацкіх традыцый;

фарміраваць практычныя навыкі і творчыя здольнасці навучэнцаў сродкамі беларускай народнай творчасці, павышаць матывацыю да даследчай дзейнасці і развіваць пазнавальную актыўнасць навучэнцаў;

выхоўваць павагу да народнай культуры, гісторыі, пашыраць веды, удасканальваць этнакультурныя і даследчыя кампетэнцыі, майстэрства па выкананні і прэзентацыі мастацкіх твораў;

садзейнічаць сацыялізацыі асобы ва ўмовах сучаснага грамадства з улікам выхаваўча-адукацыйнага патэнцыялу беларускай народнай спадчыны.

1.6 Конкурс праводзіцца ***з лютага па лістапад 2024 года.***

Намінацыі конкурсу:

- *“Культурныя традыцыі і абрады роднага краю”* (народныя абрады і святы, народная тэатральная творчасць, вусная народная творчасць, традыцыйны побыт беларусаў);
- *“Музычная спадчына маёй Радзімы”* (народныя музычныя і харэаграфічныя традыцыі, песеннае, танцавальнае, інструментальнае мастацтва беларусаў);
- *“Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны”* (мастацкія творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйныя рамёствы і промыслы беларусаў).

У кожнай з намінацый прадстаўляюцца праекты, якія накіраваны на даследаванне, захаванне, папулярызацыю традыцыйнай культуры беларусаў, мастацкую рэканструкцыю і творчае пераасэнсаванне народнай спадчыны ў сучасных умовах.

## II. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

2.1 У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, педагагічныя работнікі, якія ажыццяўляюць падтрымку праектна-даследчай дзейнасці і яе метадычнае суправаджэнне.

2.2 Узроставая катэгорыя ўдзельнікаў конкурсу: 10–13 гадоў, 14–18 гадоў.

## III. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1 На кожным этапе конкурсу ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты):

на першым этапе – кіраўнікамі ўстаноў адукацыі;

на другім, трэцім этапах – адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

на чацвёртым (заключным) этапе – Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Аргкамітэт узначальвае старшыня. Аргкамітэт кожнага этапу конкурсу фарміруе і зацвярджае склад журы.

3.2 Рэспубліканскі аргкамітэт:

інфармуе ўпраўленні адукацыі аблвыканкамаў, камітэт па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта аб умовах правядзення конкурсу і яго выніках;

фарміруе і зацвярджае склад экспертнай камісіі і журы конкурсу;

прымае матэрыялы на конкурс і арганізуе іх экспертызу;

зацвярджае на аснове пратакола пасяджэння экспертнай камісіі і журы вынікі конкурсу і ўзнагароджвае пераможцаў і прызёраў.

3.3 Рэспубліканскі конкурс праводзіцца ў чатыры этапы:

**першы этап** (адборачны) – праводзіцца ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, уключае распрацоўку і рэалізацыю праектаў;

**другі этап** (адборачны) – раённы, раённы для гарадоў, якія маюць раённы падзел, гарадскі (акрамя г. Мінска). Раённы (гарадскі) аргкамітэт арганізуе

экспертызу праектных работ навучэнцаў на адпаведнасць умовам конкурсу і прадстаўляе іх у абласны, Мінскі гарадскі аргкамітэт;

**трэці этап** (адборачны) – абласны, Мінскі гарадскі. Арганізацыя экспертызы матэрыялаў, вызначэнне пераможцаў і прызёраў абласнога, Мінскага гарадскога этапаў конкурсу.

На дадзеным этапе ў конкурсе прымаюць удзел установы адукацыі абласнога і Мінскага гарадскога падпарадкавання;

**чацвёрты этап** (заключны) – верасень – лістапад 2024 года – рэспубліканскі. Праводзіцца ў два туры:

*папярэдні тур (экспертны)* – верасень – кастрычнік 2024 года – экспертыза і ацэнка праектных работ экспертнай камісіяй. Аўтары і аўтарскія калектывы лепшых праектаў па выніках папярэдняга тура запрашаюцца для творчай абароны-прэзентацыі праектаў у Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі;

*выніковы тур (фестываль праектаў)* – лістапад 2024 года – падвядзенне вынікаў, ацэнка творчай абароны-прэзентацыі праектаў журы, вызначэнне пераможцаў і прызёраў конкурсу.

Установы адукацыі рэспубліканскага падпарадкавання прымаюць удзел у чацвёртым этапе рэспубліканскага конкурсу.

3.4 Тэрміны правядзення першага, другога і трэцяга этапаў конкурсу папярэднічаюць тэрміну правядзення заключнага этапу і вызначаюцца ўстановамі адукацыі, адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

3.5 Для ўдзелу ў чацвёртым (заключным) этапе конкурсу ў рэспубліканскі аргкамітэт **да 12 верасня 2024 года** абласным, Мінскаму гарадскому аргкамітэтам неабходна прадставіць:

*інфармацыйна-арганізацыйныя матэрыялы конкурсу* па электроннай пошце nchtdm@nchtdm.by з паметкай (Нашчадкі традыцый – назва рэгіёна):

зводную заяўку на ўдзел у конкурсе па прапанаванай форме (дадатак 1);

выпіску з пратакола рашэння абласных (Мінскага гарадскога) аргкамітэтаў па выніках правядзення абласнога (Мінскага гарадскога) этапаў конкурсу, маніторынг удзелу ў конкурсе (дадатак 2);

спасылку на Google-дыск, дзе размяшчаюцца праекты ўдзельнікаў адпаведна конкурсных намінацый (ствараецца абласнымі (Мінскім гарадскім) аргкамітэтамі);

*лепшыя праектныя работы навучэнцаў – **да 6 праектаў*** па выніках правядзення абласных, Мінскага гарадскога этапаў дасылаюцца на адрас рэспубліканскага аргкамітэта (220030, г. Мінск, вул. Кірава, 16, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, аддзел навукова-метадычнага і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дадатковай адукацыі, тэл. 8 (017) 379 56 61, каб. 307) і размяшчаюцца на Google-дыску адпаведна конкурсных намінацый.

Пры адсутнасці вышэйпералічаных матэрыялаў конкурсныя работы да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу не дапускаюцца.

3.6 Праект складаецца з тэкставай (друкаванай) распрацоўкі і відэароліка з дэманстрацыяй вопыту і вынікаў праектнай дзейнасці. Матэрыялы прадстаўляюцца на беларускай мове.

3.7 Афармленне і структура тэкставай распрацоўкі праекта ўключае наступныя часткі:

тытульны ліст (змяшчае: поўную назву ўстановы; тэму праекта; прозвішча, імя навучэнца(-цаў)-аўтара(-аў) праекта; узроставую катэгорыю; назву аб'яднання па інтарэсах; прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка праекта, яго пасаду, горад, год);

змест (уключае назву ўсіх загалоўкаў з указаннем нумароў старонак, на якіх размяшчаюцца матэрыялы);

пашпарт праекта (уключае: назву праекта; тып праекта; адукацыйную вобласць; метады, выкарыстаныя ў праекце; формы прадстаўлення вынікаў праекта; установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваецца праект);

уводзіны (аб'ём да 2 старонак): абгрунтаванне актуальнасці і ідэі, мэты і задачы праекта;

асноўная частка (аб'ём да 12 старонак) уключае тэарэтычны і практычны раздзелы, у якіх раскрываецца змест, аналізуюцца розныя пункты гледжання па праблеме даследавання, прадстаўленыя ў літаратуры; даецца апісанне і аналіз шляхоў і метадаў вырашэння праблемы; апісанне працэсу і зместу праектнай дзейнасці, мастацкага (творчага) прадукту праекта, выкарыстоўваецца даследчы матэрыял;

заключэнне (абагульняюцца і аналізуюцца вынікі праектнай дзейнасці);

спіс літаратуры;

дадаткі могуць уключаць даведачна-суправаджальныя, фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, распрацоўкі сцэнарыяў, тэхналагічныя карты, фотаілюстрацыі, буклеты, дадатковыя табліцы, графікі, малюнкі і іншыя матэрыялы, неабходныя для лепшага разумення зместу і атрыманых вынікаў.

Праект выконваецца ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі фарматавання: тэкст работы друкуецца з дзвюх старонак ліста ў фармаце А4 з палямі: злева – 30 мм, справа – 10 мм, зверху і знізу – 20 мм у тэкставым рэдактары Word, шрыфтам № 14 Times New Roman, міжрадковы інтэрвал – адзінарны. Загалоўкі друкуюцца малымі літарамі (першая – вялікая). Нумарацыя старонак – на ніжнім полі па цэнтры. Усе наяўныя ў тэксце гіперспасылкі, QR-коды павінны быць рабочымі.

Спіс літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў варта размясціць у канцы дакумента ў адпаведнасці з патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (Загад ад 08.09.2016 № 206). У тэксце спасылкі на літаратуру афармляюцца ў квадратных дужках.

3.8 У відэароліках аўтары прэзентуюць вопыт і дэманструюць прадукты праектнай дзейнасці: мастацкую рэканструкцыю святочна-абрадавых комплексаў, тэатральных прадстаўленняў і інш. з выкарыстаннем адпаведных элементаў, мастацкія вырабы народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, творы музычнага песеннага, інструментальнага, харэаграфічнага фальклору і інш. Аўтары выкарыстоўваюць непасрэдны каменціраваны паказ

у дэманстрацыі вынікаў і прадуктаў творчай праектнай дзейнасці, рашэнні даследчых і практычных задач.

Працягласць відэароліка – да 10 хвілін, тэхнічныя параметры: HD 1280 x 720; 1920 x 1080; фармат відэафайла – mp 4, AVI.

IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

4.1 Экспертызу прадстаўленых матэрыялаў у папярэднім (экспертным) туры заключнага этапу конкурсу праводзіць экспертная камісія, якая фарміруецца са спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, запрошаных спецыялістаў адпаведнага напрамку дзейнасці.

4.2 Аўтарскія калектывы праектаў у кожнай намінацыі конкурсу, якія па выніках папярэдняга (экспертнага) тура маюць высокі рэйтынг, запрашаюцца для творчай абароны-прэзентацыі праекта ў рамках выніковага тура заключнага этапу конкурсу.

4.3 Крытэрыі ацэнкі праектаў у папярэднім (экспертным) туры:

актуальнасць і значнасць, аргументацыя канцэпцыі праекта;

унікальнасць, самабытнасць, адпаведнасць нацыянальным мастацкім традыцыям;

лагічнасць, паўната раскрыцця тэмы;

самастойнасць даследавання;

стыль, мова выкладання матэрыялу (яснасць, вобразнасць, лаканічнасць, лексіка, граматыка);

наяўнасць абгрунтаваных высноў;

культура афармлення і прэзентацыі праекта;

адпаведнасць узросту;

мастацкая выразнасць і якасць выканання (для творчых прадуктаў праектнай дзейнасці);

лагічнасць, паўната прадстаўлення і творчая прэзентацыя вопыту і вынікаў праектнай дзейнасці (для відэароліка).

4.4 Аўтарскія калектывы праектаў – удзельнікі заключнага этапу конкурсу – узнагароджваюцца дыпломамі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

4.5 Ацэнку творчай абароны-прэзентацыі ў выніковым туры (фестываль праектаў) праводзіць рэспубліканскае журы, якое фарміруецца са спецыялістаў адпаведнага напрамку дзейнасці – прадстаўнікоў арганізатараў, устаноў вышэйшай адукацыі, грамадскіх аб'яднанняў і іншых зацікаўленых арганізацый па запрашэнні аргкамітэта.

Патрабаванні да творчай абароны-прэзентацыі праекта:

працягласць творчай абароны-прэзентацыі – да 10 хвілін;

колькасць навучэнцаў, удзельнікаў творчай абароны-прэзентацыі ў выніковым туры (аўтары-праекта і навучэнцы групы падтрымкі) – у намінацыях "Культурныя традыцыі і абрады роднага краю", "Музычная спадчына маёй Радзімы" – да 12 чалавек; у намінацыі "Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны" – да 8 чалавек;

дазваляецца ўдзел педагагічных работнікаў у суправаджэнні творчай прэзентацыі.

4.6 Крытэрыі ацэнкі творчай абароны-прэзентацыі праекта ў выніковым туры:

унікальнасць, адпаведнасць нацыянальным мастацкім традыцыям;

лагічнасць, паўната раскрыцця тэмы праекта;

арыгінальнасць ідэі, самабытнасць мастацкага ўвасаблення;

культура прэзентацыі праекта;

адпаведнасць узросту;

лаканічнасць і творчы падыход у прэзентацыі праекта.

4.7 Па выніках правядзення творчай абароны-прэзентацыі праектаў у выніковым туры журы вызначае пераможцаў і прызёраў з улікам рэйтынгу праектаў у папярэднім (экспертным) туры конкурсу. Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаюцца ў кожнай з трох намінацый і дзвюх узроставых катэгорыях 10–13 гадоў, 14–18 гадоў.

4.8 Пераможцы і прызёры конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступеняў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у кожнай з трох намінацый і дзвюх узроставых катэгорыях 10–13 гадоў, 14–18 гадоў.

4.9 Журы пакідае за сабой права на вызначэнне колькасці прызавых месцаў у намінацыях. Колькасць прызавых месцаў можа быць павялічана або паменшана.

4.10 Фінансаванне раённых і абласных этапаў конкурсу ажыццяўляецца ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, што выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

4.11 Фінансаванне заключнага этапу мерапрыемстваў фестывалю-конкурсу ажыццяўляецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, выдзеленых на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4.12 Выдаткі па праездзе навучэнцаў, удзельнікаў выніковага тура заключнага этапу конкурсу (фестываль праектаў), забяспечваюцца накіроўваючым бокам. Выдаткі педагагічных работнікаў і суправаджаючых асоб – за кошт накіроўваючай арганізацыі.

4.13 Аргкамітэт фестывалю-конкурсу пакідае за сабой права ўсе матэрыялы (відэа і друкаваная прадукцыя), створаныя ў перыяд правядзення конкурсу, выкарыстоўваць на мерапрыемствах некамерцыйнага характару. Лепшыя праекты навучэнцаў выдаюцца ў рэспубліканскім зборніку, друкуюцца ў навукова-метадычным часопісе “Выхаванне і дадатковая адукацыя” і прэзентуюцца ў рамках правядзення рэспубліканскіх і рэгіянальных мерапрымстваў.

4.14 Арганізатары конкурсу маюць права на апрацоўку персанальных дадзеных удзельнікаў (публікацыю спісаў пераможцаў і прызёраў, выданне дыпломаў, афіш і г. д.). Удзел у конкурсе азначае аўтаматычную згоду ўдзельнікаў і іх афіцыйных прадстаўнікоў з умовамі конкурсу і з правам арганізатараў на апрацоўку персанальных дадзеных.

4.15 Арганізацыя і правядзенне ўсіх этапаў конкурсу асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі гарадскога, абласнога і рэспубліканскага падпарадкавання. Інфармацыя аб правядзенні і выніках конкурсу будзе размешчана на сайце Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (http://method.nchtdm.by).

Дадатак 1

Зводная заяўка (назва абласной установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі) на ўдзел у заключным этапе IV Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”

| № п/п | Намінацыя | Узроставая катэгорыя 10–13 гадоў; 14–18 гадоў | Назва праекта | Навучэнцы, удзельнікі праекта. Прозвішча і імя цалкам | Аб’яднанне па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (аў), кіраўніка (оў) праекта цалкам, пазначыць пасаду | Назва і адрас установы адукацыі цалкам | Адрас электроннай пошты і нумар тэлефона для сувязі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

- *У дыпломах выкарыстоўваюцца дадзеныя згодна зводных заявак, якія прадстаўлены абласнымі (Мінскім гарадскім) аргкамітэтамі.*

Дадатак 2

Маніторынг удзелу ў IV Рэспубліканскім фестывалі-конкурсе даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”

| Этапы | Колькасць прадстаўленных праектаў усяго (з іх УДАДзіМ) | Колькасць удзельнікаў-навучэнцаў усяго (з іх УДАДзіМ) | Колькасць педагагічных работнікаў, якія ажыццяўлялі метадычнае суправаджэнне праектаў усяго (з іх УДАДзіМ) | Колькасць устаноў адукацыі усяго (з іх УДАДзіМ) |
|---|---|---|---|---|
| Раённы этап | | | | |
| Абласны (Мінскі гарадскі) этап | | | | |